Обращает внимание тот факт, что цифры на сохранившихся фрагментах монеты имеют разное начертание (изображения на штемпель были нанесены путем гравировки, а не при помощи пуансонов), фрагмент Погони очень нечеткий. Это может указывать на то, что обрезалась монета, уже являющаяся кустарной подделкой солида.

Можно уверенно предположить**,** что данная обрезанная монета является попыткой сымитировать медные копейки Русского царства, чеканенные в период правления царя Алексея Михайловича. Но тот факт, что эта монета была найдена с серебряными копейками Петра I Алексеевича, может свидетельствовать о возможной принадлежности этой монеты к подделке копеек этого царя. Учитывая, что во время правления Петра I Алексеевича эмиссия медных «проволочных» монет не проводилась, то для фальсификации серебряной копейки было необходимо дополнительно нанести на медную основу поверхностный слой, имитирующий драгоценный металл. Обычно в качестве поверхностного слоя применяли олово, либо монеты серебрили, используя амальгаму. Для точного установления наличия поверхностного покрытия, а также определения метода его нанесения, необходимо применить точные физические методы исследования (РФА), что будет осуществлено в дальнейших исследованиях.

В. А. Кабрынец
Пінск, Беларусь

«ЧЫСТЫ» РУСКІ СКАРБ З в. ІШКАЛДЗЬ БАРАНАВІЦКАГА РАЁНА

У 2017 г. у фонды Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь быў перададзены комплекс з 223 ці 224 рускіх «драцяных» манет (частка манет знаходзіцца ў зліпленым стане, што пакуль не дазваляе вызначыць іх дакладную колькасць) і кавалачак медзі. Вядома, што яны складалі частку скарба, які быў знойдзены побач з в. Ішкалдзь Баранавіцкага раёна ўвосень 2017 г. Месца знаходкі размяшчаецца на ўскрайку поля, дзе, мяркуючы па ўсім, працякаў ручай ці дробная рачулка. Рэштак керамічнай тары не выяўлена, таму не выключана, што скарб быў схаваны ў арганічны пакунак.

Вызначэнне захаванай часткі скарбу паказала, што манеты прадстаўлены капейкамі трэцяй чвэрці XVII ст. з імем рускага цара Аляксея Міхайлавіча (1645–1676). Комплекс складаецца з 1 срэбнай, 221 ці 222 медных капеек, а таксама 1 капейкі, метал якой не вызначаны. Сярод манетнай медзі выяўлены манеты маскоўскай (23 адз.) і пскоўскай (57 адз.) чаканкі. З-за моцнай карозіі 105 манет складана аднесці да аднаго з вядомых дзенежных двароў. 36 ці 37 манет уяўляюць сабою слупкі па 2–3 адзінкі, сярод якіх прысутнічае маскоўская і пскоўская чаканка.

Верагодная прычына тэзаўрацыі скарбу з в. Ішкалдзь крыецца ў бурлівых падзеях вайны Рускага царства і Рэчы Паспалітай 1654–1667 гг. Вядома, што ў чэрвені 1660 г. рускія войскі пацярпелі паражэнне недалёка ад в. Палонка (цяпер – Баранавіцкі раён). Не выключана, што знойдзены комплекс мог быць маёмасцю аднаго з рускіх вайскоўцаў, які ўдзельнічаў у гэтай бітве.

Р. І. Крыцук, А. М. Плавінскі
Мінск, Беларусь

МІНСКІ СКАРБ МАНЕТ XVII ст. СА ЗБОРУ МЮНЦКАБІНЕТА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

Скарб быў знойдзены ў перыяд з 1996 г. па 1998 г. ў Мінску, за Палацам спорту (цяпер – праспект Пераможцаў, 4) на беразе р. Свіслач. Дэпазіт быў перададзены В. Н. Рабцэвічу В. А. Сазонавым. Скарб складаецца са 121 манеты, большая частка з якіх – зацёртыя і моцна пашкоджаныя вокісламі.

У складзе дэпазіта абсалютна пераважаюць шэлягі Шведскай Прыбалтыкі, а таксама фальсіфікаты гэтых манет. У невялікай колькасці маюцца манеты Рэчы Паспалітай. Чаканка Прусіі прадстаўлена адным шэлягам.

Склад скарба:

Эльблёнг:

Хрысціна Аўгуста (1632–1654), шэляг 16XX г.

Шведскія Інфлянты, Рыга:

Густаў II Адольф (1611–1632), шэлягі 1626 г., 1628 г.;